# З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!



Паважаныя выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі ўніверсітэта! Прыміце шчырыя віншаванні з Новым годам – гэтым казачным святам, якое мы будзем сустракаць праз некалькі дзён.

Што хочацца пажадаць вам, дарагія сябры, у хвіліны, калі стары год будзе перадаваць свае паўнамоцтвы новаму? Канешне, дабрабыту, здзяйснення мар, цікавых адкрыццяў, прыемных сустрэч і знаёмстваў. Няхай кожны дзень 2017 года будзе напоўнены выключна пазітывам, шчырасцю ды цеплынёй. Няхай радасць навагодняга свята не згасне і на працягу ўсяго года будзе натхняць вас на высакародныя справы.

Здароўя вам і вашым блізкім, шчасця, любові!

**А.У. ЯГОРАЎ,**
**рэктар ВДУ імя П.М. Машэрава.**

# ВІНШУЕМ!

На пачатку снежня ў Наўгародскім дзяржаўным універсітэце імя Яраслава Мудрага праходзіла абласное свята асветы, адукацыі і навукі «Яраславаў дзень-2016». Адным з цэнтральных яго мерапрыемстваў стаў урачысты сход, падчас якога былі ўручаны галоўныя ўзнагароды расійскай ВНУ – медалі Яраслава Мудрага і рэгаліі звання «Ганаровы доктар НаўДУ». Прыемна, што гэта званне атрымаў прарэктар па вучэбнай рабоце нашага ўніверсітэта В.І. Туркоўскі.

Веслаў Іосіфавіч зрабіў значны ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва паміж Наўгародскім і нашым універсітэтамі: як каардынатар праектаў у рамках праграмы ТЭМПУС быў адным з арганізатараў міжнародных канферэнцый і семінараў, пад яго кіраўніцтвам былі падрыхтаваны сумесныя публікацыі навукоўцаў наўгародскай і нашай навучальных устаноў, праведзены тыдні расійска-беларускага супрацоўніцтва і абмен студэнтамі і выкладчыкамі. Акрамя таго, па ініцыятыве В.І. Туркоўскага была распрацавана і рэалізавана сумесная магістарская праграма «Адукацыйны менеджмент».

На сённяшні дзень завяршаецца праект «Подготовка педагогов и образовательных менеджеров к работе с гетерогенными группами и организаторами», а ў кастрычніку паміж Наўгародскім і нашым універсітэтамі было падпісана пагадненне аб сумеснай рэалізацыі праекта «Становление и развитие педагогической метатеории управления многообразием в образовательных системах».

Веслаў Іосіфавіч адзначыў, што прысуджэнне яму ганаровага звання – гэта, у першую чаргу, прызнанне грамадскай значымасці сумеснай работы двух універсітэтаў. Студэнты і выкладчыкі павінны і надалей развіваць супрацоўніцтва паміж нашымі ВНУ.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

Упраўленне Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці ўзнагародзіла **Іну Міхайлаўну Прышчэпа**, прарэктара па навуковай рабоце нашага ўніверсітэта, граматай за значны ўнёсак у развіццё і ўдасканаленне дзейнасці ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці.

За паспяховую сумесную работу ў 2016 годзе з «Настаўніцкай газетай» па праекце «Творчае супрацоўніцтва і ўзаемадапамога ў галіне адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій» граматай узнагароджана **Лілія Львоўна Алізарчык**, загадчык аддзялення даўніверсітэцкай падрыхтоўкі.

КОНКУРС

# КРАСАВИЦ ВЫБРАЛИ

Традиционный конкурс грации и артистического мастерства «Мисс ВГУ-2016» в этом году проводился в четырнадцатый раз. Его темой стал эпохальный ретро-стиль pin up. Оценивали конкурсанток и выбирали лучших члены жюри: известный белорусский фэшн-бьюти-фотограф, обладательница многочисленных мировых наград в области фотографии Дарья Матросова, директор студенческого дома моды ВГТУ, финалистка V Национального конкурса красоты «Мисс Беларусь-2006» Екатерина Жизневская, руководитель школы танца «Flow» (г. Витебск) Константин Шилин, обладательница титула «Мисс ВГУ-2015» Анна Величко, председатель профкома студентов нашего университета и по совместительству председатель судейской коллегии Алексей Трубин. Каждая девушка должна была принять участие в дефиле, продемонстрировать свои знания в интеллектуальном конкурсе и подготовить творческий номер. Что касается последнего, то большинство красавиц выбрало танец.

Оригинальным было выступление студентки ХГФ Юлии Кравчук. Девушка и ее помощницы танцевали в темноте на сцене в белых платьях со светящимися крыльями. Именно Юлии был присвоен титул «Мисс Стиль». Не менее эффектным был танец, посвященный любви, конкурсантки Анастасии Разумовой. Девушка настолько вжилась в роль своей героини, что ей присвоили титул «Мисс Артистизм». Впечатлила зрителей и песня в исполнении студентки ФОИГ Ферузы Матмурадовой. Во время ее номера в зале один за другим включались фонарики на мобильных телефонах. Участница одержала победу в номинации «Мисс Обаяние».

Во время интеллектуального конкурса девушки отвечали на различные вопросы ведущих и рассказывали о своем хобби и достижениях. Лучше всех с этим справилась студентка ФСПиП Дария Тарасенко, которой присвоили титул «Мисс Интеллект».

Кроме этого, титул «Мисс Мода» получила Юлия Барановская (ЮФ), титул «Мисс Грация» – Анастасия Матросова (ХГФ), титул «Мисс Творчество» – Кристина Торопова (ИФ), «Мисс Оригинальность» – Юлия Колесникова (ФФКиС), «Мисс Индивидуальность» – Александра Вильчик (ФФКиС), «Мисс Романтичность» – Августина Серпачёва (ЮФ), которая также победила в интернет-голосовании.

Второй вице-мисс стала Дария Тарасенко, первой – Юлия Барановская, а заветная корона и титул «Мисс ВГУ-2016» достались студентке ФлФ Анастасии Разумовой. Все конкурсантки были награждены специальными подарками от спонсоров мероприятия.

**Инна ШИРКЕВИЧ,**
**студентка 3 курса ФлФ.**
**Фото О. ЛУЗГИНОЙ.**




**На снимке: победительницы конкурса красоты.**

# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## Навіны, падзеі, факты

На пачатку снежня ў Віцебску праходзіў рэспубліканскі семінар кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі «Музей установы адукацыі – цэнтр актывізацыі пошукавай, даследчай і праектнай краязнаўчай дзейнасці». Перад удзельнікамі семінара ў нашай ВНУ выступілі прарэктар па выхаваўчай рабоце І.В. Бондал і дэкан гістарычнага факультэта В.А. Космач. Затым адбылася экскурсія па музеях універсітэта. Гасцей прымалі ў народным музеі гісторыі ўніверсітэта і народным мемарыяльным пакоі-музеі П.М. Машэрава (кіраўнік В.У. Пуцеева), народным літаратурным музеі (загадчык І.В. Саматой), народным музеі біялагічнага факультэта (кіраўнік У.І. Піскуноў).

***

105 год з дня свайго заснавання адзначыў Аршанскі каледж УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава». Павіншаваць яго выкладчыкаў і навучэнцаў прыйшлі дырэктары школ, ліцэяў і каледжаў, выпускнікі і шматлікія госці. Ад імя нашага ўніверсітэта ў святкаванні юбілею прыняў удзел першы прарэктар В.В. Маліноўскі.

***

ТВУ зноў у ліку пераможцаў. На гэты раз карэспандэнты ўніверсітэцкага тэлебачання сталі прызёрамі Трэцяга адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча «Я снимаю кино». Сёлета на суд кампетэнтнага журы было прадстаўлена больш за 120 работ. Па выніках конкурсу дыплом ІІ ступені ў намінацыі «Тэматычная праграма» атрымала праграма ТВУ «Всё и сразу», дыплом ІІІ ступені ў намінацыі «Рэклама» – прома-ролік «ВГУ – это мы» (Андрэй Краўчанка, Алена Корабава), дыплом ІІ ступені ў намінацыі «Сацыяльны ролік» – відэазамалёўка «Спасибо за Победу!» (Андрэй Краўчанка, Вольга Ханіс, Канстанцін Ханіс).

***

На факультэце матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій нашага ўніверсітэта прайшла міжнародная акцыя «Час кода». Варта адзначыць, што ў акцыі, у якой задзейнічаны дзясяткі мільёнаў людзей са 180 краін свету, Віцебск прыняў удзел упершыню. «Час кода» – гэта цудоўная магчымасць для школьнікаў паспрабаваць сябе ў якасці праграміста, выконваючы заданні ў гульнёвай форме. Па выніках акцыі 52 юныя праграмісты ІТ-акадэміі «Мир будущего» факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій ВДУ імя П.М. Машэрава атрымалі сертыфікаты ўдзельнікаў, а лепшыя хлопцы і дзяўчаты – падарункі на памяць.

***

Студэнты факультэта фізічнай культуры і спорту прынялі ўдзел у рэспубліканскіх спаборніцтвах, дзе годна прадставілі наш універсітэт. Так, Антон Стэльмахаў заняў трэцяе месца на Рэспубліканскай універсіядзе-2016 па боксе (г. Мінск). Барыс Смычкоў і Ілья Кокшанцаў сталі першымі на Кубку Рэспублікі Беларусь па таэквандо (г. Мінск), другое месца тут заняла Карына Сафронава, а трэцяе – Алег Сацык.

***

Прадстаўнікі Полацкага каледжа УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» прынялі ўдзел у рэспубліканскім конкурсе постарматыватараў «Быть здоровым – это здорово!» сярод навучэнцаў устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдне-спецыяльнай адукацыі. Па выніках конкурсу дыпломам І ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Молодежь против наркотиков» былі ўзнагароджаны Лада Купрыяновіч і Дзіяна Булевіч (група 32Т спецыяльнасці «Турызм і гасціннасць») за постар-матыватар «Выбери свой берег» (кіраўнік І.А. Губская).

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

# ОДИН ДИПЛОМ ХОРОШО, А ДВА – ЛУЧШЕ

Руководство нашего вуза постоянно заботится о том, чтобы сотрудники повышали свою квалификацию. И если есть возможность за бюджетные деньги осуществить переподготовку специалистов, то почему бы это не сделать.

Такая возможность представилась два года тому. Проректор по учебной работе В.И. Турковский предложил сотрудникам нашей альма-матер пройти переподготовку по специальности «Педагогическая деятельность специалистов» в ИПКиП при Белорусском государственном педагогическом университете имени Максима Танка. Когда были сформированы две группы и заключен договор с институтом, для 51 сотрудника нашего вуза началась совсем другая жизнь: лекции, семинарские занятия, зачеты, экзамены. И все это без отрыва от производства. Связующим звеном между слушателями и преподавателями ИПКиП была методист учебного отдела И.Э. Балашова. Инна Эдуардовна всегда была готова помочь. Необходимую информацию куратор отправлял коллегам по электронной почте. Помогали И.Э. Балашовой старосты групп: О.Ю. Лесная, заместитель декана исторического факультета, и Т.А. Толкачёва, доцент кафедры химии.

Почти за 24 месяца был вычитан полный курс лекций, сданы зачеты, экзамены. Наступил самый ответственный момент — государственный экзамен. Все слушатели сдали его успешно и получили хорошие и отличные оценки.

Долгожданный день вручения дипломов был назначен на середину декабря. С приветственным словом выступили директор ИПКиП Ирина Владимировна Шеститко, ее заместитель Александр Васильевич Маковчик, декан факультета повышения квалификации специалистов образования Ольга Валерьевна Клезович и др.

Ирина Владимировна говорила с душевной теплотой о каждом слушателе, подчеркивая его достоинства и достижения. В.И. Турковский, выступая перед коллегами, отметил, что это первые сотрудники вуза, которые прошли переподготовку по специальности «Педагогическая деятельность специалистов». Этим они внесли неоценимый вклад в свое будущее и будущее университета.

Затем каждому слушателю под громкие аплодисменты был вручен диплом, а некоторым и сувениры — кружки.

**НАШ КОРР.**

**На снимках:** во время вручения дипломов.

**Фото О. ЛУЗГИНОЙ.**







# ДЕНЬ ОТКРЫТЫХ ДВЕРЕЙ

В субботу, 10 декабря, ВГУ имени П.М. Машерова распахнул свои двери для абитуриентов 2017 года. Будущие студенты (жители Витебска и ребята, приехавшие из Витебской и Могилевской областей) посетили в этот день наш вуз, чтобы узнать, на какие специальности будет осуществляться набор абитуриентов в 2017 году, и лично познакомиться с представителями каждого факультета и профессорско-преподавательским составом университета.

На организационном собрании, которое проходило в актовом зале главного корпуса, перед школьниками выступили проректор по учебной работе В.И. Турковский и заведующий подготовительным отделением Л.Л. Ализарчик. После собрания будущие абитуриенты встретились с деканами, заведующими кафедрами и преподавателями факультетов, которые проконсультировали ребят по предметам централизованного тестирования.

Примечательно, что 40% поступающих заинтересовались историей Беларуси, 30% школьников выбрали для себя математику. Не остался без внимания ребят и такой предмет, как творчество.

Я же, пользуясь случаем, поговорила с будущими абитуриентами и поинтересовалась, откуда они приехали, на какой факультет собираются поступать и почему.

**Янина Миронович:**

– Я приехала из Сенненского района. Выбрала для себя биологический факультет, так как считаю, что смогу проявить себя на этом факультете.

**Алиса Щегол:**

– Приехала я из Городокского района. Хочу стать студенткой художественно-графического факультета. Рисую с раннего детства. Думаю, что сделать из своего хобби профессию – это вполне неплохая идея.







биология – интересная наука.

**Кристина Новикова:**

– Я из города Глубокое. Собираюсь поступать на педагогический факультет, потому что хочу продолжить семейную династию.

**Владислав Корбан:**

– Я родом из Витебска. Решил поступать на факультет математики и информационных технологий. Мне интересны точные науки, и я надеюсь, что

**Николай Борозда:**

– Я приехал из Докшицкого района. Выбрал для себя факультет физической культуры и спорта. Надеюсь, что смогу реализовать себя именно в этой сфере деятельности, так как увлекаюсь спортом.

Хочется пожелать всем абитуриентам 2017 года высоких баллов на тестировании и легкого поступления. Надеюсь встретить вас среди первокурсников нашего университета в следующем учебном году.

**Вера ЛАБЗОВА,**
**студентка 3 курса ФлФ.**

**На снимках:** во время проведения дня открытых дверей в университете.

**Фото О. ЛУЗГИНОЙ.**

# ГАЛОЎНЫЯ ПАДЗЕІ 2016 ГОДА

***Напярэдадні Новага года прынята падводзіць вынікі таго, што зроблена за год бягучы. Для нашага ўніверсітэта 2016-ы быў даволі плённым. Чым ён запомніўся, узгадаем разам.***

**Студзень.** Супрацоўнікі і выкладчыкі нашай ВНУ напярэдадні Дня беларускай навукі атрымалі пачэсныя ўзнагароды. Так, Ганаровыя граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь уручылі кандыдату гістарычных навук, дацэнту, дацэнту кафедры гісторыі Беларусі Т.С. Бубенька і доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, прафесару кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі М.М. Вараб'ёву. Ганаровыя граматы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь былі ўручаны доктару біялагічных навук, прафесару, прарэктару па навуковай рабоце І.М. Прышчэпа і кандыдату фізіка-матэматычных навук Ю.І. Бохану. Ганаровымі граматамі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў былі ўзнагароджаны кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дэкан юрыдычнага факультэта А.А. Бачкоў і кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры прыкладной псіхалогіі Н.В. Кухтава. Доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства В.А. Маслава атрымала Ганаровую грамату Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

**Люты.** Сталі вядомы імёны лаўрэатаў конкурсу «Чалавек года Віцебшчыны». Сярод пераможцаў – прадстаўнікі нашага ўніверсітэта: доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі М.Ц. Вараб'ёў, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва М.Л. Цыбульскі і студэнтка завочнага аддзялення педагагічнага факультэта, настаўніца вышэйшай катэгорыі Шумілінскай дзіцячай школы мастацтваў А.І. Скарынава.

**Сакавік.** У пятнаццаты раз у нашым універсітэце прайшоў фестываль мастацкай творчасці студэнтаў «Хіт-парад», у якім па традыцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх факультэтаў, а таксама Полацкага і Аршанскага каледжаў. Тэмай гэтага года стала «Культура. Сила традиций и творчества». Па выніках фестывалю кампетэнтнае журы аб'явіла пераможцаў. Так, трэцімі сталі студэнты юрыдычнага факультэта, другімі – хлопцы і дзяўчаты педагагічнага, а першае месца і званне лаўрэата атрымаў філалагічны факультэт.

**Красавік.** Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі адзначылі машэраўцы сумесна з калегамі са СмалДУ. У рамках візіту расіян у Віцебск адбыўся адкрыты дыялог студэнцкіх актываў і быў праведзены цудоўны святочны канцэрт, падрыхтаваны прадстаўнікамі дзвюх вышэйшых навучальных устаноў.

**Май.** Насычаным для студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта выдаўся май гэтага года. Машэраўцы прынялі ўдзел у прафарыентацыйна-адукацыйным праекце «Рэспубліканская ўніверсітэцкая субота-2016» і ў VI Рэспубліканскім студэнцкім форуме, што праходзіў у Магілёве.

Рэктар А.У. Ягораў сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Германіі ў Рэспубліцы Беларусь Петэрам Дэтмарам. Акрамя гэтага, у маі стала вядома, што наша ВНУ занесена на Дошку гонару горада Віцебска за дасягненне найлепшых паказчыкаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця і эканоміі паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў.

**Чэрвень.** Па традыцыі напрыканцы вучэбнага года вызначылі пераможцаў у конкурсах «Лепшая студэнцкая група ВДУ-2016» і «Лепшы куратар ВДУ-2016». Пераможцамі першага сталі: 21-я група біялагічнага факультэта (трэцяе месца), 21-я група філалагічнага факультэта (другое месца) і 31-я група юрыдычнага факультэта (першае месца).

Пачэснае званне «Лепшы куратар» атрымала дацэнт кафедры крымінальнага права і крымінальнага працэсу Т.Ф. Дзмітрыева. На другім месцы – старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі М.І. Трафімава, на трэцім – старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту Л.І. Марціновіч.

**Ліпень.** Рэктар універсітэта А.У. Ягораў і студэнт пятага курса факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі Уладзіслаў Цітоў сталі дэлегатамі V Усебеларускага народнага сходу.

Апроч таго, на ўсіх факультэтах нашага ўніверсітэта прайшло ўручэнне дыпломаў выпускнікам. Сёлета нашу навучальную ўстанову скончылі 1624 чалавекі, з іх 765 – студэнты дзённага аддзялення, 862 – завочнага. Прыемна, што 54 выпускнікі атрымалі чырвоныя дыпломы.

**Верасень.** Некалькі соцень нашых студэнтаў з розных факультэтаў былі накіраваны на сельскагаспадарчыя работы ў РУП «Талачынскі кансервавы завод», каб дапамагчы сабраць ураджай яблыкаў і бульбы. Па традыцыі былі падведзены і вынікі летняй педагагічнай практыкі ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. З кожнай установы ўніверсітэт атрымаў станоўчыя водгукі аб рабоце машэраўцаў, а Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» даслаў падзяку на імя рэктара.

**Кастрычнік.** На першым у гэтым навучальным годзе пасяджэнні савета ўніверсітэта нагрудныя знакі «Выдатнік адукацыі» былі ўручаны кандыдату псіхалагічных навук, дацэнту, дацэнту кафедры псіхалогіі Т.Я. Касарэўскай і кандыдату біялагічных навук, дацэнту, дацэнту кафедры заалогіі С.І. Дзянісавай.

У кастрычніку адразу некалькі афіцыйных дэлегацый наведалі нашу ВНУ: Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Оберг і дырэктар Цэнтра шведскіх даследаванняў Анастасія Майская, дэлегацыя выкладчыкаў, студэнтаў і магістрантаў Зеленагурскага ўніверсітэта (Польшча), дэлегацыя Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага.

**Лістапад.** Багатым на святочныя падзеі выдаўся апошні месяц восені для ВДУ імя П.М. Машэрава. 106 год адзначылі машэраўцы з дня заснавання сваёй ВНУ, 20 – з дня выхаду першага нумара газеты «Мы і час» і 5 – з дня заснавання ТВУ. Да таго ж сёлета споўнілася 15 год студэнцкаму савету і 10 год – прафілакторыю ўніверсітэта. Свой 10-гадовы юбілей адзначыў і ансамбль ветэранаў педагагічнай працы «Ліра».

Падрыхтавала
**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

# А ГОД БЫЛ ИНТЕРЕСНЫМ…

*Совсем немного времени осталось до наступления 2017 года. Каким он будет: легким или сложным, позитивным или не очень, спокойным или насыщенным событиями – покажет время. Пока же давайте вспомним год уходящий и узнаем у студентов и преподавателей нашего университета, чем для них он был знаменателен?*

**Николай Тимофеевич Воробьёв, доктор физико-математических наук, профессор, заведующий кафедрой алгебры и методики преподавания математики:**

– Этот год был очень насыщенным и продуктивным для нашей кафедры. Мы успешно справились со всеми стоящими перед нами задачами как в науке, так и в учебной работе. Вместе с коллегами нам удалось успешно завершить пятилетнее задание по государственной программе научных исследований «Конвергенция» и на конкурсной основе войти в число исследователей по этой программе на следующие пять лет (2016 – 2020 гг.).

Год был знаменателен еще и тем, что я был приглашенным профессором в Университете науки и технологий Китая, где работал совместно с китайскими учеными, постдокторами китайского университета и аспирантами. Отмечу, что с китайской стороной мы дружим уже более 20 лет, у нас есть совместные научные работы по математике в самых престижных журналах мирового уровня. А недавно я получил ценный подарок – книгу известного китайского профессора, куда вошли десять моих теорем с доказательствами. Книга издана ведущим международным издательством «Springer».

Приятно было также узнать, что я стал обладателем почетного звания «Человек года Витебщины-2015». В семейном плане радует то, что у меня появилась внучка.

**Яна Богатырёва, студентка 4 курса филологического факультета:**

– Год уходящий был насыщен событиями. Он подарил мне новые знакомства, эмоции и впечатления. Запомнились и победа филологического факультета на фестивале художественного творчества студентов «Хит-парад», и работа летом в качестве корреспондента на международном фестивале искусств «Славянский базар в Витебске», и осенняя стажировка в городе Зелена Гура в Польше. Спасибо моим друзьям, которые всегда были готовы поддержать и помочь.

**Светлана Ивановна Денисова, кандидат биологических наук, доцент, доцент кафедры зоологии:**

– Уходящий 2016 год был особенным: мне исполнилось 70 лет, я была награждена знаком «Отличник образования» и выпустила монографию «Взаимоотношения китайского дубового шелкопряда с кормовыми растениями в Беларуси». Сейчас я работаю над научным проектом Белорусского республиканского фонда фундаментальных исследований.

Очень порадовали меня студенты: на протяжении года они все старались, учили, отвечали. Уверена, что наступающий год будет не менее плодотворным.

**Олеся Николаевна Астапкович, начальник отдела охраны труда и безопасности:**

– 2016 год для меня был весьма насыщенным. Летом я закончила магистратуру в нашем университете по специальности «Образовательный менеджмент» и защитила магистерскую диссертацию на тему «Нормативные и психолого-педагогические основы эффективного управления охраной труда в классическом вузе». А буквально на днях получила диплом о переподготовке по специальности «Педагогическая деятельность специалистов» на базе Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка.

В будущем хочу и дальше совершенствовать свои знания английского языка и компьютерной грамотности.

**Андрей Александрович Сухарев, доцент, заведующий лабораторией правового информирования:**

– Накануне Нового года вспоминается только хорошее. Плодотворно в уходящем году поработала лаборатория правового информирования. Студенты, которые учатся на юридическом факультете и являются сотрудниками нашей лаборатории, посещали школы и выступали перед ребятами по различным правовым вопросам. Причем в этом году мы совершили рекордное количество выходов в учреждения образования Витебска и районов области (больше 80) и поделились своими правовыми знаниями с 2000 школьников.

Зародилась у нас и новая традиция: вместе с адвокатами и преподавателями факультета проводить в школах дни правовых знаний и целый день бесплатно консультировать учителей, учащихся и их родителей. И, конечно, важное событие для нашего факультета в уходящем году – переезд в главный корпус.

Лично для меня 2016 год был знаменателен еще и тем, что увидела свет моя книга «Беларусь северная». Уверен, что следующий год будет ничем не хуже нынешнего.

**Анастасия Красовская, магистрант художественно-графического факультета:**

– За 2016 год произошло так много всего, что сразу и не вспомнишь. Летом я сдала государственные экзамены, получила диплом о высшем образовании и поступила в магистратуру. Новый этап начался и в личной жизни: я вышла замуж. Что касается творчества, то я работала над дизайном обложки для музыкального диска и рисовала иллюстрации к детским сказкам. Потрясающая новость пришла из Сербии: в номинации «Книжная иллюстрация» на выставке-конкурсе «Неделя современного искусства» моя работа заняла первое место.

В целом, 2016 год был хорошим. Я побывала в Москве и Санкт-Петербурге, познакомилась с интересными людьми: поэтом Александром Серовым, писательницей Маиной Боборико, дизайнером Олегом Кончугой, иллюстратором Антоном Ломаевым.

**Подготовила Елизавета ЯСЮКЕВИЧ, студентка 3 курса ФлФ.**

# АПАНТАНАСЦЬ — ЯГО ЖЫЦЦЁ



Не памылюся, калі скажу, што Міхася Леанідавіча Цыбульскага, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта, дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва, сябра Беларускага саюза мастакоў, лаўрэата ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2015» ведаюць не толькі ў Прыдзвінскім краі, але і далёка за межамі Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы яму віцябчане знаёмяцца са шматлікімі творамі жывапісу, прыкладнога мастацтва і графікі. Міхась Цыбульскі заняты кожную хвіліну, часта працуе па начах да самага світанку, каб паспець падрыхтаваць матэрыял пра творцаў Віцебскай мастацкай школы, новую выставу або выязны пленэр для чарговай энцыклапедыі, кнігі ці рэспубліканскіх і мясцовых выданняў.

З вялікай самаадданасцю, ніколі не шкадуючы часу, мастацтвазнавец знаёміць незлічоную колькасць дэлегацый, камісій, розных афіцыйных асоб (перш за ўсё замежных) з гісторыяй і культурай Віцебшчыны.

Прамовы Міхася Цыбульскага на адкрыцці выстаў — гэта дакладнае адлюстраванне яго душы, дакладны адбітак яго сутнасці. У іх мы бачым мастака, заўзятага прыхільніка нацыянальных традыцый, мудрага настаўніка і непераўзыдзенага прамоўцу. Ён жыве не толькі лекцыямі, канферэнцыямі, творчымі сустрэчамі, але і паспявае звярнуцца да палатна, ад канкрэтных здарэнняў пераносіцца да іх жывога і пластычнага сімвала. Нездарма на яго выставы заўсёды прыходзіць шмат гасцей і наведвальнікаў.

Мастак-педагог умее перадаць студэнтам частку сваёй творчай энергіі і натхніць іх на новыя адкрыцці. Моладзь яго любіць, заўжды з ім раіцца, паважае яго як выдатнага мастака, добразычлівага і спагадлівага дарадцу, чалавека з неверагодным пачуццём гумару.

Зусім нядаўна, падчас святкавання 106-годдзя з дня заснавання нашай альма-матар, на цырымоніі ўручэння спецыяльнай прэміі «Docendo discimus» Міхась Леанідавіч атрымаў сімвалічную статуэтку і дыплом у намінацыі «За ўнёсак у развіццё мастацтва і культуры».

Наперадзе ў М.Л. Цыбульскага мноства творчых праектаў і выстаў, пленэраў і знаёмстваў з маладымі перспектыўнымі мастакамі, якім ён перадасць свае веды і вопыт.

**Фёдар ШКІРАНДА.**

ЮБІЛЯРЫ

# ГЛАВНЫЕ ПОБЕДЫ ВПЕРЕДИ



О работе корреспондента Андрей Кравченко, руководитель ТВУ, обладатель специальной премии университета «Docendo discimus» в номинации «За вклад в развитие искусства и культуры», мечтал со школьной скамьи и готовился поступать в Институт журналистики БГУ. Но так сложились обстоятельства, что юноша стал студентом исторического факультета нашего университета и постигал тайны музейного дела и охраны историко-культурного наследия.

Молодой человек охотно посещал лекции и основательно готовился к семинарским занятиям. А когда студенты начали изучать туристические маршруты зарубежных стран, у Андрея возникла идея создать свой маршрут по родному городу – виртуальную экскурсию «Витебск туристический», что он и сделал вместе со своим одногруппником Андреем Машуриным.

Нужно сказать, что мультимедийная экскурсия легла в основу дипломной работы юноши, руководителем которой была доктор искусствоведения, профессор Т.В. Котович. Впоследствии виртуальный маршрут стал использоваться в учебном процессе на историческом факультете. А когда разработку увидел декан филологического факультета, тогда руководитель интернет-телевидения С.В. Николаенко, то пригласил Андрея на работу на ТВУ.

С тех пор прошло пять лет. Собранный, уравновешенный, знающий свое дело, Андрей вместе со студентами филологического факультета готовит выпуск за выпуском. Свое профессиональное мастерство молодой человек оттачивает и на телеканале «Витебск», где он является ведущим молодежной программы «ZaДело».

О том, что о ТВУ знают далеко за пределами вуза, свидетельствуют не только тысячи просмотров каждой передачи на ютубе, но и дипломы, которыми награждают университетское телевидение на различных конкурсах и фестивалях. В этом заслуга не только студентов, но и, в первую очередь, Андрея Кравченко – оператора, редактора и режиссера монтажа.

«Я доволен тем, как сейчас развивается интернет-телевидение ВГУ, – признается Андрей. – Именно развивается, потому что, безусловно, нам есть куда совершенствоваться. ТВУ за пять лет своего существования стало самостоятельным средством массовой информации нашего университета. Уверен, что впереди нас ждет еще много интересного: креативные сюжеты, увлекательные передачи, только положительные эмоции и, конечно же, победы на различных конкурсах».

**Слава КУЛЕШОВА.**
**Фото К. ХАНИСА.**

# МЫ ЖЕЛАЕМ СЧАСТЬЯ ВАМ!

***Преподаватели филологического факультета Л.М. Вардомацкий и Т.И. Синкевич в этом месяце праздновали юбилейные дни рождения. Поздравляя именинников, коллеги отмечали их профессионализм и человеческие качества. А вот как охарактеризовали Леонида Михайловича и Татьяну Ивановну те, с кем они ежедневно делятся своими знаниями и отдают частичку своего сердца.***



Глядя на этого преподавателя, можно с уверенностью сказать: перед нами человек со светлой душой и большим сердцем, человек слова и дела, который всегда даст ценный совет и охотно поможет в любой ситуации.

А таких ситуаций было очень много, особенно в то время, когда Л.М. Вардомацкий возглавлял филологический факультет. Ведь за 25 лет работы деканом Леонид Михайлович тысячам студентов помог найти свою дорогу в жизни, подготовил большое количество профессионалов, которые успешно работают в сферах образования, науки и культуры. Выпускники филологического факультета с теплотой и благодарностью сегодня вспоминают годы учебы и самого добродушного и справедливого декана.

Л.М. Вардомацкий – по-настоящему добрый, вежливый и отзывчивый педагог. Все мы прекрасно знаем, что преподавать непросто. Нужно не только знать и любить свой предмет, но и уметь увлекательно рассказывать, заинтересовывать, находить общий язык с молодежью. И все это у Леонида Михайловича прекрасно получается!

**Ольга ВОЙТОВА,**
**студентка 4 курса ФлФ.**

Татьяна Ивановна Синкевич – строгий и требовательный преподаватель, опытный педагог, готовый всегда проконсультировать каждого студента и помочь ему.

Татьяна Ивановна хотела поступить на факультет международной журналистики Московского государственного университета, но по семейным обстоятельствам не смогла уехать в Москву и стала студенткой филологического факультета Витебского государственного педагогического института имени С.М. Кирова (сегодня – ВГУ имени П.М. Машерова).

С 1991 года Т.И. Синкевич работает на родном факультете, а сегодня еще и преподает дисциплину «Русский язык как иностранный» студентам из Бангладеш и Пакистана в Витебском государственном технологическом университете. Большой опыт работы и любовь к своей профессии позволяют Татьяне Ивановне получать максимальные результаты. Студенты-иностранцы, которых она обучает, имеют неплохие знания по русскому



языку. А желающим просто «отсидеться» на занятиях не везет: для каждого преподаватель найдет задание.

Татьяне Ивановне нравятся любознательные студенты. Она и сама любит узнавать все новое, много путешествует, побывала в 36 странах Европы, Азии и Африки. Самые яркие воспоминания у преподавателя связаны с посещением Испании и Китая.

**Игорь ОВЧИННИКОВ,**
**студент 4 курса ФлФ.**
**Фото**
**К. ВЕТРЕННИКОВА.**



*Уважаемые Леонид Михайлович и Татьяна Ивановна, примите искренние поздравления с юбилеем и наступающим Новым годом. Желаем вам крепкого здоровья, блеска в глазах и огромного интереса к жизни. Будьте счастливы и радуйте нас, студентов, своим оптимизмом и прекрасным настроением!*

# ПАДАРОЖЖА Ў КАЗКУ



Тыдзень студсавета на філалагічным факультэце заўсёды насычаны дабрачыннымі мерапрыемствамі. Сёлетні год не стаў выключэннем: 14 снежня валанцёры факультэта разам з намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце Вольгай Генадзьеўнай Валошчанка адправіліся ў Вялікалятчанскі дзіцячы дом. Усяго трыццаць хвілін на маршрутцы, кіроўца якой, даведаўшыся пра мэту паездкі валанцёраў, вырашыў іх падвезці да самага будынка дзіцячага дома.

Пакуль хлопцы і дзяўчаты рыхтаваліся да сустрэчы з дзецьмі, зала хутка напаўнялася цікаўнымі гледачамі, якія з нецярпеннем чакалі пачатку праграмы. Гэта было сапраўднае падарожжа ў казку: у госці завіталі добрая Фея, незвычайны Цуд, Сняжынкі, злосная Чараўніца, якая ўвесь час спрабавала сапсаваць свята, але дзеткам атрымалася яе перавыхаваць. І канешне ж, галоўнымі ў гэты вечар былі Дзед Мароз і яго ўнучка Снягурка.

Больш за гадзіну ў актавай зале не сціхалі вясёлы гоман і смех, гучалі навагоднія песні, казачныя героі ладзілі вясёлыя танцы, а пасля ўсіх закружыў шумны карагод вакол святочнай ёлкі. З прыўзнятым настроем і салодкімі падарункамі дзеці пайшлі вячэраць.

Студэнты, у сваю чаргу, адправіліся на экскурсію па дзіцячым доме, якую правёў намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Леанід Уладзіміравіч Дук. Госці зазірнулі ў кожную «сям'ю» (а іх у дзіцячым доме дзевяць: «Сябры», «Надзея», «Любоў» і інш.), з задавальненнем пагутарылі з дзецьмі і выхавацелямі, падзівіліся з утульных пакояў, што былі ўпрыгожаны малюнкамі і вырабамі выхаванцаў.

Адчуванне таго, што агульнымі намаганнямі быў створаны невялікі навагодні цуд, які падарыў радасць і святочны настрой дзецям, саграваў душу студэнтаў. І, вяртаючыся ў горад, яны зусім не заўважалі халоднага зімовага надвор'я, бо на тварах у іх была светлая ўсмешка, а на душы – радасць.

**Ірына МІКУЦКАЯ,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**
**Фота М. ТАРАСЕВІЧ,**
**студэнткі 4 курса ФлФ.**

# ПАДАРУНАК АД ДУШЫ

На пачатку снежня студэнты-валанцёры філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта, сярод якіх і аўтар матэрыяла, у рамках Тыдня студсавета факультэта наведалі Віцебскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Для яго жыхароў у якасці падарунка мы падрыхтавалі невялічкую канцэртную праграму з вершамі, песнямі і танцамі. Сцэнарыстам выступіла трэцякурсніца Ірына Мікуцкая.

Прыемна, што ў доме-інтэрнаце нас сустрэлі як родных. У зале панавала цёплая святочная атмасфера, і выступаць нам было толькі за радасць. Кожнага студэнта, які выходзіў на сцэну, жыхары інтэрната сустракалі шчырымі апладысментамі. А мы, у сваю чаргу, імкнуліся зрабіць усё, каб іх парадаваць.

Трэцякурсніца Дар’я Прыгожая і аўтар матэрыяла выканалі вядомыя песні «А за окном то снег, то дождь» і «А он мне нравится», а студэнтка трэцяга курса Наталля Тарарышкіна выступіла з кампазіцыяй «Соловейка».

Вершы «Здароў, марозны, звонкі вечар!» паэта Максіма Багдановіча і «Люблю зіму» Генадзя Бураўкіна выразна і эмацыянальна прачыталі студэнтка другога курса Юлія Рудзякова і пяцікурсніца Галя Брахун, а другакурсніца Ірына Радзіхоўская прадставіла на суд гледачоў верш уласнага сачынення «Казка».

Даспадобы прыйшоўся жыхарам інтэрната і танец «Валенки» трэцякурсніц Вольгі Зязюлі і Яны Цывіс.

Пасля святочнага канцэрта мы ўручылі нашым гледачам падрыхтаваныя загадзя салодкія падарункі. Спадзяёмся, у гэты вечар жыхары інтэрната змаглі хоць на імгненне адчуць сябе дзецьмі, якія чакаюць сапраўднага цуду. І вось ён адбываецца… А для нас самым галоўным падарункам былі шчырыя ўсмешкі і слёзы шчасця тых, хто, на вялікі жаль, навагоднія святы сустрэне без родных і блізкіх.

**Надзея РАДЗЕЎСКАЯ,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**

# З ПАВАГАЙ ДА РОДНАГА СЛОВА

Не так даўно на філалагічным факультэце нашага ўніверсітэта прайшоў Тыдзень беларускай мовы, на працягу якога студэнты праводзілі розныя конкурсы, акцыі і віктарыны, прысвечаныя роднай мове, літаратуры і культуры.

Адкрылі тыдзень хлопцы і дзяўчаты, якія чыталі вершы, прысвечаныя роднаму слову, і спявалі беларускія песні. А гэта Ірына Радзіхоўская, Кацярына Іванова, Юлія Рудзякова, Вольга Раманенка, Марк Цыганкоў і інш.

У аўторак Таццяна Кукуць, Надзея Радзеўская і Лізавета Яжгурова правялі віктарыну «Я ведаю беларускія вершы». Удзельнікам неабходна было па прапанаваных чатырохрадкоўях пазнаць іх аўтараў.

У сераду прайшла акцыя «Размаўляй са мной па-беларуску», якую правялі Ірына Данілава і Анастасія Бучкіна. У гэты дзень хлопцы і дзяўчаты ўспаміналі класікаў беларускай літаратуры і іх запаветныя творы. У чарговы раз нашы філолагі выдатна справіліся з заданнем, прадэманстраваўшы грунтоўныя веды па літаратуры.

У чацвер Дар'я Андрыцо, Крысціна Дайлідзёнак і Ірына Данілава прапанавалі студэнтам перакласці на беларускую мову словы з іншых моў свету.

У апошні дзень святочнага тыдня ўсе ахвотныя маглі пабачыць тэатралізаваную пастаноўку «"Мудрости začало и конецъ..." або Спакушэнне Францыска Скарыны», якую падрыхтавалі студэнты-філолагі. На пачатку спектакля перад гледачамі выступіла кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Алена Сяргееўна Дзядова, якая ўзгадала асноўныя этапы станаўлення і развіцця роднай мовы, распавяла пра яе сучасны стан. Прамова выкладчыка была лаканічнай і ў той жа час змястоўнай ды пазнавальнай. Затым да прысутных звярнулася кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Галіна Канстанцінаўна Семянькова (яна ж, дарэчы, рэжысёр спектакля), якая расказала пра аднайменны твор, што лёг у аснову тэатралізаванай пастаноўкі, і яго аўтара Івана Штэйнера. Варта адзначыць, што п'еса выбрана выкладчыкам невыпадкова: яна прымеркавана да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое будзем адзначаць у нашай краіне ў наступным годзе.

Потым пачаўся спектакль. Самадзейныя артысты так праўдзіва ігралі, што змаглі перадаць атмасферу той эпохі, у якой жыў наш першадрукар. Запомнілася ўсім акцёрская ігра Марка Цыганкова, Паўла Куляшова, Аляксандра Сахоненкі, Дзмітрыя Калпакова. Нельга не адзначыць і цудоўную ігру Крысціны Дайлідзёнак – адзінай дзяўчыны, якая сапраўды ўпрыгожыла спектакль, па-майстэрску выканаўшы ролю сакратаркі. Асабліва ўразіла гледачоў акцёрская ігра выкладчыкаў нашага факультэта: Віталя Феліксавіча Падстаўленкі, Вадзіма Эльдаравіча Зіманскага і Сяргея Уладзіміравіча Лапунова.

Тыдзень беларускай мовы – адна з самых цудоўных традыцый на філфаку, дзякуючы якой студэнты могуць паразмаўляць на мілагучнай матчынай мове, адчуць сапраўдную прыгажосць беларускага слова. Вельмі важна ў сучасным свеце не згубіць сваёй роднай мовы і ўсведамляць, што мы – беларусы і нам ёсць што сказаць па-беларуску.

**Юлія РУДЗЯКОВА,**
**студэнтка 2 курса ФлФ.**

**На здымку:** студэнты і выкладчыкі – удзельнікі тэатралізаванай пастаноўкі.

**Фота Н. РАДЗЕВІЧ.**

